# Абрад “Звязда” адрадзілі і пастаянна праводзяць у вёсцы Маркавічы

**У нашых продкаў існавала традыцыя: са свята Ражаства Хрыстова і да 12 студзеня віншаваць аднавяскоўцаў і жыхароў суседніх вёсак, ходзячы па хатах са “Звяздой” і выконваючы вершы і песні аб нараджэнні Хрыстовым. Абрад “Звязда” адрадзілі і пастаянна праводзяць у вёсцы Маркавічы, дзе ён не менш любімы, чым знакамітая “Сула”.**




Уласна “Звязда” — гэта васьміканцовая зорка, вырабленая з драўляных палачак, ўпрыгожаная лентамі, фальгой і кветкамі, з іконай Ражаства пасярэдзіне. Не будзе перабольшваннем сказаць, што менавіта нашы землякі аднавілі і зноў падарылі Гомельшчыне гэты святочны сімвал. Маркавіцкая “Звязда” з калекцыі народнага майстра Рэспублікі Беларусь Віктара Шыпкова

неаднаразова дэманстравалася на розных выставах як рэспубліканскіх, так і міжнародных.

На працягу шэрагу гадоў Віктар Шыпкоў разам з роднымі і сябрамі з'яўляецца ініцыятарам правядзення абрада “Звязда” ў вёсках Маркавічы і Гадзічава, віншуе аднавяскоўцаў, абвяшчаючы добрую навіну: “Хрыстос нарадзіўся!”. Не перапынілася традыцыя і сёлета.

“З Раством Хрыстовым. Радуйся, ой, радуйся землях, сын Божы нарадзіўся!” – такімі словамі удзельнікі абраду  віталі падчас выканання духоўных песень гаспадароў.

*– Спадзяюся, аднавяскоўцы заўва-жылі невялікія змены ў абрадзе, якія яшчэ больш наблізілі яго да традыцыі: акрамя традыцыйнага зімовага адзення, сёлета мы аднавілі выкарыстанне званочкаў. У ранейшыя часы менавіта яны апавяшчалі жыхароў вёскі Маркавічы аб тым, што прыйшла «Звязда» ў двор, а разам з ёй і «Весела навіна»,* – расказвае Віктар Шыпкоў.

Сёлетняе Ражаство асабіста для яго запомніцца і тым, што ў абрадзе “Звязда” ўпершыню прымалі ўдзел яго дзеткі. Пераемнасці пакаленняў энтузіяст-краязнаўца надае вельмі важнае значэнне, бо толькі так можна захаваць спрадвечныя традыцыі.



*— Ведаеце, гэта першы год, калі па ўсёй вёсцы я сустрэў толькі адну хату, дзе на куце было сена, і ў ім стаяла куцця. На жаль, з кожным годам адыходзяць носьбіты традыцыі, пусцее без іх вёс-ка, але ж «Звязду» чакаюць з нецярпеннем амаль у кожнай хаце,* — адзначае Віктар. — *Розніца толькі ў тым, што людзі сталага веку, напрыклад, адна са старэйшых нашых жыхарак Ефрасіння Філіпаўна Цацукова, якой ужо 99 год, не разумеюць, як можна сядзець падчас выканання Кандака і трапара Ражаства. Больш за тое, далучаюцца да яго выканання. А вось маладзёны, якім ад 15 да 20 год, часам не стараюцца нават адарвацца ад тэлефона, не кажучы ўжо пра тое, каб стаяць пры выкананні Хрыстаслаўных сальм…*

Захавальнік народных традыцый упэўнены, што ў Хрыстаславаў сёння ёсць і такі абавязак: навучаць, расказваць, як патрэбна сябе паводзіць і што трэба рабіць, дзе перахрысціцца, дзе пакланіцца хатнім абразам і калі патрэбна пацалаваць іконачку

Ражаства Хрыстова, якая ў вянку з кветак займае цэнтраль-нае месца ў маркавіцкай «Звяздзе».

*— Сёлета своеасаблівы юбілей: у гэтым абрадзе я ўдзельнічаю ўжо ў дваццаты раз. У свой час пра традыцыю хадзіць са “Звяздой” даведаўся ад свайго настаўніка Рыгора Ціханавіча Басава. І ўпершыню ўдзельнічаў у абра-дзе са “Звяздою”, якую калісьці зрабіў яго бацька. Прыгажосць і ўзнёсласць абраду так захапілі, што хутка ў мяне з’явілася і свая зорка-сімвал, зробленая дзедам, і вялікае жаданне больш і больш пазнаваць народную культуру і традыцыйныя звычаі. Гэта дазволіла занатаваць шмат калядак і духоўных вершаў, якія выконваліся падчас абраду. Хочацца, каб і наш прыклад таксама захапіў моладзь, прывіў ёй новыя інтарэсы,* — падкрэсліў Віктар Шыпкоў.

Між тым у Маркавічах большасць жыхароў і сёння ўпэўнена: прыём Хрыс-таславаў прыносіць шчасце ў дом. А таму верыцца, што добрая традыцыя будзе жыць і захоўвацца.



sozhnews